*even now, and capable of changing overnight, capable of infinite adaptation to circumstance; you live as readily on Pluto as on Mercury or Earth. Any place is a home-world to you. You can adapt yourselves to any condition. And – most dangerous to them – you can do it instantly* [1].

По мере развития сюжета происходит всё большее сближение Машины и Человека. Постепенно всё живое на Земле погибает, и Машины берут на себя функции своих создателей, воплощают собой симбиоз естественного и искусственного начал, объединяя в себе их лучшие проявления. Роботы становятся «живыми организмами» / «each a living thing unto itself», готовыми пожертвовать собой.

В финале рассказа в живых остаются лишь два человека, два учёных-изобретателя. В диалоге между ними Джон Кэмпбэлл выражает основную идею и мысль произведения. Эпохе Человека настал конец и причина этого – его неспособность к самообеспечению, культура потребления, жизнь за счет труда других.

*First, he ate of the energy, which plants had stored, then of the artificial foods his machines made for him. Man was always a makeshift; his life was always subject to disease and to permanent death. He was forever useless if he was but slightly injured; if but one part were destroyed* [1].

**Заключение**. Таким образом, рассказ Дж. У. Кэмпбэлла «Венец творения» антиутопичен по своей сути. Автор демонстрирует читателю крах цивилизации, вызванный слабостью и несовершенством природы Человека. Стремясь создать идеальный социальный строй, освободиться от необходимости добывать пищу, одежду и кров, люди остановились в своём развитии как биологический вид, за чем последовало его неизбежное исчезновение. Только переход от потребления к созиданию может остановить уже запущенный процесс, повернуть его вспять и тем самым спасти человечество от вымирания уже не в литературе, а в реальности.

1. Campbell, J.W. The Last Evolution / J.W. Campbell [Electronic resource] // The Project Gutenberg EBook. – Mode of access: https://www.gutenberg.org/files/27462/27462-h/27462-h.htm – Date of access: 20. 02.2019

## АФАРЫЗМЫ Ў ТВОРАХ ВАСІЛЯ БЫКАВА

***Арэшка Ю.В.,***
*студэнтка 3 курса БрГУ імя А.С. Пушкіна, г. Брэст, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Яўдошына Л.І., канд. філал. навук, дацэнт

Афарызмы ў творах пісьменнікаў не толькі элемент паэтыкі, але і адметны складнік мастацкага ідыялекту, выразнік аўтарскага светабачання. Афарыстыка Васіля Быкава ўключалася ў пэўныя фразеаграфічныя працы, але пакуль не станавілася прадметам манаграфічнага вывучэння, што абумоўлівае актуальнасць прапанаванага даследавання, мэтай якога з'яўляецца вызначэнне функцыянальна-семантычнай значнасці афарыстычных выслоўяў пісьменніка ў кантэксце яго твораў і светапоглядных установак.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для даследавання паслужылі ваенныя аповесці В. Быкава "Трэцяя ракета", "Альпійская балада", "Круглянскі мост", "Абеліск", "Воўчая зграя", "Аблава", "Пакахай мяне, салдацік", "Ваўчыная яма" і аўтабіяграфічная кніга "Доўгая дарога дадому". У якасці асноўных метадаў аналізу фактычнага матэрыялу абраны аналітычна-апісальны і семантычна-стылістычны.

**Вынікі і іх абмеркавнне.** Кожны мастацкі твор набывае большую вартасць, калі яго змест поўніцца трапнымі выслоўямі, афарызмамі, якія актыўна ўключаюць чытача ў свет думак, разваг. Менавіта такой уласцівасцю валодаюць творы Васіля Быкава, у змесце якіх вока чытача чапляецца за пранікнёны думкі, смелыя выказванні. Літаратуразнаўца М. Тычына трапна адзначае, што з імем В. Быкава "звязваецца ўяўленне аб пісьменніку, які некалькі дзесяцігоддзяў адкрываў свету праўду пра тое, што такое сучасная вайна ў яе сапраўдным аблічны" [1, с. 640]. Пажыццёвым дэвізам В. Быкава было "служэнне праўдзе". Гэта стала вызначальным, скразным у грамадскай дзейнасці і мастацкай творчасці пісьменніка. Таму значная частка афарыстычных выслоўяў празаіка адводзіцца тэме важнасці і вартасці жыцця, якое кожны чалавек павінен пражыць з годнасцю. Так, у аповесці "Абеліск" пісьменнікам ствараецца вобраз смелага і дасціпнага настаўніка Ткачука, які напрыканцы твора з абурэннем на сучасных людзей, што імкнуцца ўсё максімальна спрасціць, прамаўляе словы, якія нагадваюць, што жыццё немагчыма спрасціць да адной зручнай схемы: *Жыццё – гэта мільёны сітуацый, мільёны характараў. І мільёны лёсаў* [2, с. 154]. У гэтай жа аповесці заўважаем афарызм, праз які аўтар даводзіць думку пра абмежаванасць чалавечага жыцця ў часе, яго хуткаплыннасць: *Жыццё чалавечае надта несувымернае з вечнасцю, і што ці пятнаццаць гадоў, ці шэсцьдзесят – усё не болей чымсьці імгненне ў вечнасці часу* [2, с. 147]. У аповесцях "Воўчая зграя", "Воўчая яма" і "Доўгая дарога дадому" таксама сустракаем афарыстычныя выслоўі, што падкрэсліваюць каштоўнасць жыцця, яго непрадказальнасць, часам цяжкасць, але разам з тым і веліч: *Жыць усім хочацца. Ды не ўсім выходзіць* [2, с. 210]; *Жыццё рэдка песціць чалавека спраўджаннем ягоных мараў, жыццё мае звычку рабіць па-свойму. Але і чалавек любіць, каб было па ягоным, вось і ўзнікаюць тады нелады, якія часам кепска канчаюцца* [3, с. 263]; *Жыцьцё – усё ж бязьлітасная рэч, для яго яшчэ ў дзяцінстве патрэбна загартавацца характарам* [4, с. 11]. І як квінтэс-



Репозиторий БрГУ

энцыя быкаўскіх разваг пра суадносіны жыцця і смерці гучыць наступны афарызм: *Усё ж жыццё, якое б яно ні выдарылася, самае каштоўнае ў свеце перад чорным праваллем канца* [3, с. 238].

Неад'емнай часткай кожнага чалавечага жыцця з'яўляюцца высокія, шчырыя пачуцці, якія дапамагаюць чалавецтву не згубіць сябе і сваё вартаснае прызначэнне ў жыцці сусвету. Шэраг трапных выслоўяў пісьменніка ў ягоных творах дазваляе зрабіць вывад, што найбольш вартаснай уласцівасцю і праявай чалавечай натуры ён лічыў дабрыню. Так, у аповесці "Аблава" сустракаюцца два афарызмы з вышэйзгаданых: *...Яблыні, як і кветкі, без чалавечай любові расці не будуць* [5, с. 371]; *Але дабрыня, мусіць, там, дзе справядлівасць і праўда* [5, с. 417]. У аповесцях "Круглянскі мост" і "Воўчая зграя" заўважаем два нібы супрацьлеглых выслоўі: *Розная дабрата бывае. Іншая горш, чым зло…* [2, с. 26]; *А дабрата не можа быць кепскай…* [3, с. 192]. Васіль Быкаў як пісьменнік-псіхолаг слушна заўважае, што па-чалавечы можна жыць суладна з сумленнай, светлай душой, якая будзе несці дабрыню ў сэрцы навакольных: *Чулая душа – яна выдатна сама разбярэцца, дзе добрае, а дзе так сабе. Добрае ўвойдзе ў яе, як сваё, а так сабе – хутка забудзецца. Усё раздзеліцца, як на ветры зерне з мякінаю* [2, с. 115]; *Каму не вядома, што добрыя словы дактароў часам лечаць лепей за іхнія лякарствы*? [3, с. 166].

У творах Васіля Быкава яскрава прасочваецца думка, што вартасць жыцця вызначаецца тым, як чалавек паводзіць сябе ў складаных, экстрэмальных сітуацыях, перад тварам смерці. Таму шэраг афарыстычных выслоўяў аб'ядноўваецца тэмай "Шчасце, няшчасце, жыццёвыя выпрабаванні": *Але, мусіць, вялікая бяда менавіта там і падпільноўвае чалавека, дзе ён яе меней за ўсё чакае* [3, с. 242]; *…У пэўныя моманты лягчэй трываць папрок, чым пахвалу* [6, с. 202]; *Бедаку заўжды прыемна ўведаць, што камусьці яшчэ горш, чым яму* [6, с.408]. У аповесцях В. Быкава "Пакахай мяне, салдацік" і "Трэцяя ракета", дзе галоўныя героі пачынаюць усведамляць асаблівую сутнасць чалавечага жыцця, якое немагчыма без перажывання, страт, заўважаем наступныя афарызмы: *Пакуты робяць чалавека чалавекам. Чалавек без пакут – трава* [7, с. 150]; *Усё ж шчасце – яно падманнае. Гэта няшчасце – назаўжды* [8, с. 465].

Чалавек, яго ўзаемаадносіны са светам і людзьмі – важная тэма, сутнасць якой раскрываецца ў тым ліку і пры дапамозе трапных быкаўскіх выслоўяў: *І тым не менш у жыцці, аказваецца, бываюць моманты, калі мала ўсёй накопленай за гады вытрымкі, каб перажыць адну хвіліну няёмкасці* [7, с. 317]; *Ніхто чалавека не тыраніць больш, чым ён сам сябе* [7, с. 148]; *На кожным часе свае героі* [2, с. 130]; *Напэўна, кожны чалавек – ад прыроды чалавек. Жыццё робіць з яго генія або злыдня* [7, с. 150]. На думку празаіка, прасторай для паўнавартаснага існавання і дзейнасці чалавека з'яўляецца свабода (фізічная, маральная, духоўная), якая будзе нараджаць у ім светлую сілу духу: *Мабыць, кожнаму свой шлях да свабоды наканавана прайсьці асобна* [4, с. 425]; *У аснове кожнай калектыўнай свабоды ляжыць свабода індывідуальная* [6, с. 539]; *Сіле ж не трэба справядлівасці, яна сама сабе гаспадыня і кіруе сабой як хоча* [3, с. 48].

У творах В. Быкава неаднаразова падкрэсліваецца думка пра непадуладнасць часу, незваротнасць падзей, немагчымасць для чалавека вярнуць мінулае і нешта ў ім выправіць: *Але разумныя думкі звычайна спазняюцца, і таго, што здарылася, ужо не перайначыш* [2, с. 6]; *Шкада, што найкаштоўныя ісціны прыходзяць непапраўна позна* [3, с. 193]; *Пражытага не перайначыш…* [3, с. 233]; *Былое вышэй за жывое, яно ўжо непадуладнае нікому* [4, с. 343].

Асобную групу афарыстычных выслоўяў складаюць выказванні, звязаныя з вераю, рэлігіяй, якія часам выступаюць адзіным апірышчам для чалавека ў найбольш складаныя моманты яго жыцця: *Ніводзін народ, нават самы адсталы, не жыве без Бога* [8, с. 473]; *Але Бог не пакідае праведнікаў, а лёс часам дае ім птушыны хвосьцік надзеі* [4, с. 421].

Вялікай каштоўнасцю ў тэкстах В. Быкава сцвярджаюцца вечныя жыццёвыя пачуцці як альтэрнатыва антыгуманнай сутнасці ваенных выпрабаванняў: *А каханне – заўсёды сіла* [8, с. 475]; *Вечная праява жыцьця – каханьне* [4, с. 184] *…Пачуцці не маюць адказнасці перад законам, таксама як і перад розумам, таму яны і завуцца пачуццямі* [3, с. 193].

**Заключэнне.** Афарыстыка В. Быкава тэматычна шматгранная і сацыяльна абвостраная, арыентаваная на прэзентацыю пісьменніцкіх светапоглядных каштоўнасцей і маральных арыенціраў. Экзістэнцыйная праблематыка твораў і іх тэматычная накіраванасць абумовілі прысутнасць у афарызмах пісьменніка такіх вызначальных канцэптаў, як "жыццё", "смерць", "час", "вера", "свабода", "пачуцці".


1. Тычына, М. Васіль Быкаў / М. Тычына // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. – Т. 4. – Мінск, 2001 – 2002. – С. 640 – 687.
2. Быкаў, В. Збор твораў. У 6 т. Т. 3. Аповесці / В. Быкаў. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 415 с.
3. Быкаў, В. Ваўчыная яма / В. Быкаў. – Мінск : ГА БТ "Кніга", 2001. – 264 с.
4. Быкаў, В. Поўны збор твораў. У 14 т. Т. 8. Мэмуарная проза / В. Быкаў. – Мінск : Саюз беларускіх пісьменнікаў; Масква : ТАА "Выдавецтва "Время", 2009. – 576 с.
5. Быкаў, В. Збор твораў. У 6 т. Т. 5. Кар'ер: Раман: У тумане; Аблава: Аповесці / В. Быкаў. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 432 с.
6. Быкаў, В. Доўгая дарога дадому. Кніга ўспамінаў / В. Быкаў. – Мінск : ГА БТ "Кніга", 2002. – 544 с.
7. Быкаў, В. Збор твораў. У 4 т. Т. 1 / В. Быкаў. – Мінск : Маст. літ., 1980. – 429 с.
8. Быкаў, В. Пакахай мяне, салдацік : аповесці, апавяданні / В. Быкаў. – Мінск : Маст. літ., 2013. – 574 с.




Рэпазіторый ВДУ